# Паролі да твораў

## Гісторыі пра Беларусь: жаночы погляд

Мастацтвазнаўцы адзначаюць, што жанчыны-мастачкі прэтэндуюць на асобную пазіцыю ў сучаснай творчасці. Яны па-асабліваму адчуваюць навакольны свет, таксама як і адлюстроўваюць яго. Бывае, складана ўявіць, якім чынам яны змаглі ўлавіць настолькі тонкія рысы прыроды альбо скрозь хмурныя тоны ўбачылі лініі святла. На мінулым тыдні ў Мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» адбылося адкрыццё сумеснай выстаўкі жывапісу і графікі «Паралельныя гісторыі» мастачак Алы Кушнер, Наталлі Каржыцкай, Наталлі Шапавалавай, Марыны Канавалавай, Юліі Нявейкі. Творцы заклікаюць гледача падабраць правільныя паролі да іх творчасці і раскрыць свет вобразаў.



Юлія Нявейка «Песня сірэны», 2018 г.

Назва выстаўкі першапачаткова дае зразумець, што ў экспазіцыі прадстаўлена некалькі гісторый. Сапраўды, кожная жанчына робіць акцэнт на розныя складнікі нацыянальнай культуры. Адной цікава паказаць гісторыю, другой — перадаць дух малой радзімы. Мастачкі супрацоўнічаюць шмат гадоў. Яны разам ездзяць на пленэры, удзельнічаюць у экспазіцыях. Усе яны розныя, аднак паспелі стаць згуртаваным калектывам.

— Пачалося з таго, што мы пазнаёміліся з адным з аўтараў выстаўкі — мастачкай Наталляй Шапавалавай — і дамовіліся правесці яе персанальную выстаўку, — расказвае дырэктар галерэі «Універсітэт культуры» Павел Сапоцька. — Але выстаўка доўга адкладалася. Як мы жартуем сёння, напэўна, яна чакала свайго часу. Ідэя персанальнага праекта трансфармавалася ў калектыўны. У выніку выстаўка атрымалася менавіта такой: характарызуе мастачак. Па-першае, яна энергетычна жаночая, а па-другое, вельмі цёплая, а гэтага нам так не хапае ў марозным сакавіку. Выстаўка, безумоўна, набыла іншае гучанне за кошт змянення канцэпцыі: было прынята рашэнне жывапіс разнастаіць акварэллю і графікай.

Наведвальнікі галерэі засталіся ўражаныя ад пейзажаў Марыны Канавалавай, нацюрмортаў Наталлі Каржыцкай. Публіка падоўгу затрымлівалася каля партрэтаў Юліі Нявейкі, разгадваючы ў намаляваных вобразах аўтарскую задуму. Сапраўды, спатрэбяцца гадзіны, каб зразумець, наколькі ўважліва мастачкі выбудоўваюць кампазіцыі, наколькі адказна ставяцца да слова, якое адгукаецца ў фарбах і адценнях.



Ала Кушнер «Лядзенскі манастыр», 2009 г.

— Нашы аўтары — выхаванцы розных не толькі ўстаноў адукацыі, але і розных школ, — адзначае Павел Сапоцька. — Усё ж такі віцебскі мастграф, педагагічны ўніверсітэт і кафедра народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Універсітэта культуры і мастацтваў — абсалютна не падобныя адна на адну школы. У кожнай — свае методыкі выкладання. У нашых мастачак праглядаецца адметнае бачанне прыроды, фарбаў, структуры жывапісу. На цырымоніі адкрыцця праекта мастацтвазнаўцы адзначылі, што кожная з гэтых жанчын можа пахваліцца сапраўдным майстэрствам, паколькі кожная ведае, як паказаць сваю культуру, як захаваць традыцыі і не страціць іх унікальнасць. Пераважаюць на выстаўцы матывы прыроды. У Юліі Нявейкі, напрыклад, — вобразы з беларускай міфалогіі. Ёсць выявы старажытных беларускіх храмаў. Для галерэі важна, што экспазіцыя выстаўкі закранае гісторыка-культурныя аспекты.

Самі мастачкі задаволеныя, што атрымалася ўпісацца ў агульную прастору і не перашкаджаць адна адной у сэнсавым спалучэнні.

Праект стаў стартам для арганізацыі іншых сумесных выставак, мерапрыемстваў, звязаных з пытаннямі папулярызацыі айчыннай гісторыі. Хутка лета, а гэта значыць, што *магчымасцяў выязджаць* у розныя мястэчкі Беларусі будзе больш.

**Вікторыя АСКЕРА**

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ